# ПА ШЛЯХУ ВЯЛІКАГА ПАЧЫНУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

З вялікім поспехам прайшоў нядзельнік у Рэчыцы. Вось што расказвала аб гэтым газета «Палеская праўда» у нумары ад 15 сакавіка 1921 г.: «6 сакавіка па ініцыятыве ўкома РКП(б) пры ўдзеле павятовага прафбюро быў наладжан грандыёзны нядзельнік на Дняпроўскім масту. Удзельнічаў 331 чалавек, з іх 110 камуністаў. Працавалі 4 гадзіны. Нагружана на платформы камення 5 куб. сажняў, разабрана каля паромнай пераправы з уборкай матэрыялу 15 пагонных сажняў дроў і праведзены іншыя работы».

Работа транспарту ў зімовы час часта ўскладнялася з-за снежных заносаў. Асабліва цяжкай для транспартнікаў выдалася зіма 1922 года. Камуністы і камсамольцы Гомеля неаднаразова прымалі ўдзел у работах па ачышчэнню пуцей ад снегу, забяспечваючы работу транспарту.

У гэтым выдатным руху прыняло актыўны ўдзел і сялянства Гомельшчыны. Як вядома, у 1920 г. наша краіна адчувала востры недахоп у прадуктах харчавання. 5 ліпеня 1920 г. Гомельскі губвыканком атрымаў тэлеграму ад Старшыні Савета Народных Камісараў У. І. Леніна аб арганізацыі работы па выканню харчразвёрсткі і забеспячэнню хлебам галадаючых раёнаў краіны.

Аб глыбокім разуменні палітыкі партыі і яе падтрымцы гавораць масавыя суботнікі ў ліпені—жніўні 1920 г. у саўгасах Гомельскага павета па ўборцы ўраджаю хлеба і нарыхтоўцы сена, у якіх прыняло ўдзел звыш 500 чалавек.

Рад суботнікаў быў праведзены з мэтай аказання дапамогі Чырвонай Арміі. Так, агульны сход рабочых швейнай прамысловасці г. Гомеля 16 кастрычніка 1920 г. пастанавіў у сувязі з праходзіўшым у той час «Тыднем дапамогі фронту» «працаваць звышурочна па 2 гадзіны: у дзень адпачынку, суботу, 23 кастрычніка працягваць нармальную работу і адлічваць аднадзённы заработак па цвёрдаму тарыфу».

У 1921 г. у сувязі з неўраджаем і голадам у Паволжжы па ўсёй краіне быў арганізаваны збор сродкаў для працоўных Паволжжа. Гомельскія рабочыя аказалі ім значную дапамогу, арганізаваўшы рад нядзельнікаў.

Гомельскі губернскі харчовы камітэт у тэлеграме Народнаму камісару харчавання ад 10 верасня 1921 г. паведамляў, што Паволжжу адгружана 1 мільён 50 тысяч пудоў насеннага жыта.

Высокія пачуцці пралетарскага інтэрнацыяналізму праявілі працоўныя Гомельшчыны, адлічваючы частку сродкаў, запрацаваных на суботніках, у фонд дапамогі замежным рабочым. Такія адлічэнні паступалі ад рабочых саўгасаў «Хальч», «Навасёлкі», «Рэчкі» і многіх іншых прадпрыемстваў.

Прадукцыйнасць працы на камуністычных суботніках перавышала звычайную ў два, тры разы і больш.

Ленін з захапленнем адклікаўся аб тых, хто ўдзельнічаў у камуністычных суботніках. Гераізм рабочых у тыле, якія паказалі высокія ўзоры новай працы, ён параўноўваў з гераізмам чырвонаармейцаў, якія адстойвалі на франтах Савецкую Радзіму. «І вось гэтыя галодныя рабочыя, — пісаў У. І. Ленін, — акружаныя злоснай контррэвалюцыйнай агітацыяй буржуазіі, меншавікоў і эсераў, наладжваюць «камуністычныя суботнікі», працуюць звышурочна без усякай аплаты і дасягаюць велізарнага павышэння прадукцыйнасці працы, нягледзячы на тое, што яны стаміліся, змучаны, знясілены недаяданнем. Хіба гэта не велізарны гераізм? Хіба гэта не пачатак перавароту, які мае сусветна-гістарычнае значэнне?» **(У. І. Ленін, ПЗТ, т. 39, с. 21).**

Камуністычныя суботнікі выхоўвалі таварыскае супрацоўніцтва і ўзаемадапамогу, садзейнічалі развіццю творчай ініцыятывы працоўных, яшчэ вышэй уздымалі аўтарытэт Камуністычнай партыі.

«Нішто не дапамагло так павысіць аўтарытэт Камуністычнай партыі ў горадзе, так узняць павагу з боку беспартыйных рабочых да камуністаў, так як суботнікі...» **(У. І. Ленін, ПЗТ, т. 39, с. 380).**

Масавы гераізм савецкага народа, пачатак якому паклалі камуністычныя суботнікі, знайшоў сваё далейшае развіццё ў сацыялістычным спаборніцтве, вышэйшай формай якога з'явіўся рух за камуністычныя адносіны да працы.

Працоўнае спаборніцтва — гэта новая, уласцівая толькі сацыялістычнаму ладу вытворчасці рухаючая сіла яго развіцця. Яго маштабы і формы заўсёды залежалі ад вытворчых сіл грамадства, ад свядомасці і культурна-тэхнічнага ўзроўню працоўных.

Гісторыя сацыялістычнага спаборніцтва ў нашай краіне складаецца з некалькіх асноўных этапаў. Камуністычныя суботнікі ў гады грамадзянскай вайны, вытворчыя нарады ў аднаўленчы перыяд, ударніцтва першай пяцігодкі, стаханаўскі рух другой і трэцяй пяцігодак, усенароднае сацыялістычнае спаборніцтва ў дапамогу фронту ў гады Вялікай Айчыннай вайны, масавы рух наватараў вытворчасці пасляваеннага часу і, нарэшце, з пабудовай развітага сацыялізму, вялікі рух сучаснасці — сацыялістычнае спаборніцтва за камуністычныя адносіны да працы.

Сацыялістычнае спаборніцтва, як адзін з напрамкаў патрыятычнага выхавання, арганічна ўключае ў сябе ўсенародныя пачыны, пачынанні і рухі, якія з'яўляюцца вышэйшай формай праяўлення любві да сваёй Радзімы і вядуць да сцвярджэння камуністычных грамадскіх адносін.

У матэрыялах XXIV і XXV з'ездаў партыі, у пастановах ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва» (1971 г.). «Аб сацыялістычным спаборніцтве за дастойную сустрэчу XXV з'езда КПСС» (1975 г.), у пастанове ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ «Аб Усенародным сацыялістычным спаборніцтве за павышэнне эфектыўнасці вытворчасці і якасці работы, паспяховае выкананне заданняў дзесятай пяцігодкі» (1977 г.) і ў іншых дакументах партыі падкрэсліваецца, што сучасны этап развіцця грамадства, і перш за ўсё навукова-тэхнічная рэвалюцыя, ставіць перад сацыялістычным спаборніцтвам узросшыя патрабаванні, вызначае яго якасна новую ролю ў развіцці народнай гаспадаркі і выхаванні працоўных.

Выступаючы на XVI з'ездзе прафсаюзаў СССР Генеральны сакратар ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў падкрэсліваў, «што на сучасным этапе сацыялістычнае спаборніцтва набывае якасна новыя рысы, новыя асаблівасці. Спаборніцтва сёння неаддзельна ад навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Яно ўсё больш канцэнтруецца вакол праблем эфектыўнасці і якасці. Яно накіравана на дасягненне найлепшых канчатковых народнагаспадарчых вынікаў».

Такім чынам, ва ўмовах развітага сацыялістычнага грамадства, якое характарызуецца высокім узроўнем развіцця народнай гаспадаркі, сацыялістычных грамадскіх адносін, культуры і свядомасці шырокіх мас працоўных, асноўная эканамічная задача спаборніцтва заключаецца ў тым, каб арганічна звязаць творчасць мас з эканамічнай палітыкай партыі, г. зн. арыентаваць працоўных на барацьбу не толькі за якасныя паказчыкі, але і за высокую якасць прадукцыі, за эканомію сродкаў, матэрыяльных і працоўных рэсурсаў, за дзейснае і хуткае ўкараненне ў практыку навукова-тэхнічных дасягненняў, за няўхільны рост вытворчасці працы.

Адначасова ўзрастаюць сацыяльныя і выхаваўчыя функцыі спаборніцтва. У рашэннях XXIV і XXV з'ездаў партыі, у пастановах ЦК КПСС аб спаборніцтве з новай сілай падкрэсліваецца роля сацыялістычнага спаборніцтва як дзейснага метаду эканамічнага будаўніцтва, умацавання сацыялістычных адносін паміж людзьмі, як магутнага сродка развіцця творчай ініцыятывы мас, фарміравання сацыялістычнага калектывізму, як эфектыўнага метаду ўздыму прадукцыйных сіл, удасканальвання вытворчых адносін выхавання працоўных, прыцягнення іх да кіравання вытворчасцю.

У ходзе ўсенароднага сацыялістычнага спаборніцтва гэтыя патрыятычныя задачы паспяхова вырашаюцца перш за ўсё таму, што сацыялістычнае спаборніцтва ўяўляе сабой найбольш зразумелую і даступную масам працоўных патрыятычную форму далучэння іх да вырашэння ўсіх асноўных задач сацыялістычнага і камуністычнага будаўніцтва.

Адсюль вынікае, што ўдзел у спаборніцтве магчымы на любым узроўні агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай падрыхтоўкі працоўных. Больш таго, пад уплывам актыўнага ўдзелу ў спаборніцтве яна няўхільна ўзрастае. Таму кожны працоўны можа і павінен стаць актыўным удзельнікам сацыялістычнага спаборніцтва. Менавіта ў гэтым і заключаецца пярвейшы патрыятычны абавязак будаўніка камунізму.

Вялікую работу ў гэтым напрамку праводзіць Камуністычная партыя Беларусі. Сацыялістычнае спаборніцтва за паспяховае выкананне задач дзесятай пяцігодкі набыло ў рэспубліцы сапраўды ўсенародны размах. У цяперашні час у ім удзельнічаюць практычна ўсе занятыя ў прамысловасці і сельскагаспадарчай вытворчасці, у сферы абслугоўвання, на транспарце, вялікі атрад навуковых работнікаў — усяго звыш 3,8 мільёна чалавек. Больш паловы спаборнічаючых (звыш 2 мільёнаў чалавек) удзельнічаюць у руху за камуністычныя адносіны да працы.

Выступаючы са Справаздачай ЦК КПСС XXV з'езду партыі, Л. І. Брэжнеў гаварыў: «Усе мы радуемся таму, якія глыбокія карэнні пусцілі ленінскія ідэі сацыялістычнага спаборніцтва. Мы ганарымся тым, што ў авангардзе спаборніцтва ідуць камуністы. Спаборніцтва аказвае глыбокае ўздзеянне на гаспадарчую практыку, на грамадска-палітычнае жыццё краіны, на маральную атмасферу. Усямерна развіваць і далей сацыялістычнае спаборніцтва, рух да працы — такі наш агульны баявы лозунг». **(Матэрыялы XXV з'езда КПСС. Палітвыдавецтва, 1976, с. 76—77).**

Правядзенне 16 красавіка гэтага года масавага камуністычнага суботніка ў гонар 107-й гадавіны з дня нараджэння У. І. Леніна і 60-годдзя Вялікага Кастрычніка — гэта новае сведчанне перамальнасці рабочых традыцый, сведчанне вернасці савецкіх людзей ідэям Вялікага пачыну, энтузіязму шырокіх працоўных мас. Гэта грандыёзны агляд самаадданасці, высокай свядомасці, працоўнай і патрыятычнай доблесці нашага народа, яго вернасці ідэалам камунізму.

«Мы яшчэ не дасягнулі камунізму, — гаварыў Л. І. Брэжнеў. — Але ўвесь свет бачыць, што дзейнасць нашай партыі, яе імкненні накіраваны на тое, каб зрабіць усё неабходнае для дабрабыту чалавека, у імя чалавека. Менавіта гэта найвышэйшая, гуманная мэта партыі радніць яе з народам, спалучае яе з усімі савецкімі людзьмі трывалымі, непарыўнымі вузамі». **(Матэрыялы XXV з'езда КПСС, с. 88).**

**Э. ЭНЦІН,**
**кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі КПСС.**



**У лік камуністычнага суботніка папрацавалі ўжо многія студэнты ўніверсітэта. Яны былі заняты работамі па добраўпарадкаванню і азеляненню тэрыторыі ГДУ.**

**На здымку: высаджваюць дрэўцы студэнты біяфака.**

Фота **А. Карніенкі.**

*Працоўнаму семестру-77—узорную падрыхтоўку!*

# У ДОБРЫ ЧАС, «СЛАВЯНКА»!

Трэці, працоўны семестр ужо не за гарамі. Хутка будаўнічыя атрады ГДУ раз'едуцца на месцы дыслакацыі. У саўгас «Дабрынь», што ў Ельскім раёне, возьме кірунак СБА «Славянка», сфарміраваны са студэнтаў першага і другога курсаў гісторыка-філалагічнага факультэта. Такую назву байцы абралі для атрада не выпадкова. З даўніх часоў жанчына-славянка — гонар зямлі рускай. Прыгожая, шчырая славянка была добрай маці, вернай сяброўкай, а ў гады цяжкіх выпрабаванняў — у першых радах змагалася супраць ворагаў. Савецкія людзі ганарацца Васілісай Кожынай, Пашай Ангелінай, Таццянай Саламаха, Марынай Грызадубавай, Надзеяй Курчанка. Наша славянка Валянціна Церашкова — першая ў свеце жанчына-касманаўт.

У атрадзе з назвай, якая да многага абавязвае, падабраліся дзяўчаты працавітыя, баявыя, вясёлыя. На першым арганізацыйным сходзе былі распрацаваны і прыняты сацыялістычныя абавязацельствы, план культурна-масавай работы, намі ўжо вывучаны Статут СБА. На сваім камсамольскім сходзе байцы атрада аднагалосна пастанавілі: дваццаць пятым ганаровым байцом «Славянкі» залічыць слаўнага сына беларускага народа, былога сакратара ЦК ЛКСМБ Заходняй Беларусі Мікалая Дворнікава, ураджэнца г. Гомеля, які гераічна загінуў у Іспаніі. Перад гэтым усе прачыталі кнігу Я. Драбінскага «Ад Гомеля да Эстрамадуры», горача абмеркавалі яе і, залічваючы М. Дворнікава байцом свайго атрада, вырашылі працаваць і жыць пад дэвізам: «Калі падаць, дык да сонца тварам! Калі жыць — з рэвалюцыяй у сэрцы!».

Камсоргам «Славянкі» абрана выдатніца групы Б-13 Марыя Сідарэйка. Дзяўчына вучылася на падрыхтоўчым аддзяленні, працавала ў саўгасе. Камісар атрада — Ларыса Громава. Яна была ўдастоена гонару сфатаграфавацца ў Маскве каля Сцяга Перамогі. Брыгадзіры Наташа Курбан і Ніна Філіпчанка таксама прайшлі жыццёвую школу. Кіраваць агітбрыгадай даручана Наталлі Прохаравай, студэнтцы групы Б-13, выпускніцы Гомельскага музычнага вучылішча імя Сакалоўскага. Знайшлася справа па душы і Каці Бобр, якая добра малюе. Яе прызначылі адказнай за насценны друк атрада. Наташа Курбан — лаўрэат рэспубліканскага конкурсу мастацкай самадзейнасці — будзе кіраваць танцавальным гуртком. Групу лектараў «Славянкі» ўзначаліць Зіна Булахава. Курсы павароў наведвае Люда Канцавая. Кожны дзень пасля заняткаў разам з камандзірам і камісарам ідзе на вучобу ў штаб СБА майстар атрада Людміла Собаль. Многа спраў і ў Ані Мартыненка. Набліжаецца конкурс агітбрыгад універсітэта і ёй, як лепшаму майстру пашыву адзення, прыходзіцца старацца, каб касцюмы нашых дзяўчат былі самымі прыгожымі.

Байцы атрада прайшлі ўжо медыцынскі агляд. А калі ва ўніверсітэце праходзіў «Тыдзень донара», ўсе як адзін бясплатна далі кроў.

Зараз нашы дзяўчаты шмат часу праводзяць у чытальных залах, кабінетах, каб з гонарам выконваць адзін з пунктаў узятых сацыялістычных абавязацельстваў: быць прыкладам у вучобе, дапамагаць таварышам па групе.

У дзень камуністычнага суботніка «Славянка» ў поўным саставе выедзе на добраўпарадкаванне тэрыторыі ў падшэфны піянерскі лагер станкабудаўнічага завода імя Кірава. Ударнай працай у дзень «чырвонай суботы» байцы атрада прадэманструюць сваю поўную гатоўнасць да трэцяга, працоўнага семестра. У добры час «Славянка»!

**Г. КАРНАЧ,**
**камандзір атрада, студэнтка групы Б-13.**

# ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

## аб'яўляе прыём студэнтаў на 1977-78 навучальны год

### НА 1 КУРС ЗАВОЧНАГА І ВЯЧЭРНЯГА НАВУЧАННЯ ПА НАСТУПНЫХ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ:

**на аддзяленне завочнага навучання:** беларуская і руская мовы і літаратуры, руская мова і літаратура, гісторыя, біялогія, фізічнае выхаванне, эканоміка працы, арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі.

**Прыем заяў** на спецыяльнасці: **беларуская і руская мовы і літаратуры, руская мова і літаратура, гісторыя, біялогія, фізічнае выхаванне — з 20 красавіка па 31 мая, эканоміка працы, арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі — з 20 красавіка па 31 жніўня.**

Уступныя экзамены па спецыяльнасці: беларуская і руская мовы і літаратуры, руская мова і літаратура, гісторыя, біялогія, фізічнае выхаванне — **з 1 па 20 чэрвеня;** эканоміка працы, арганізацыя механізаванай апрацоукі эканамічнай інфармацыі — **з 15 мая па 10 верасня.**

Залічэнне ў састаў студэнтаў на спецыяльнасці: беларуская і руская мовы і літаратуры, руская мова і літаратура, гісторыя, біялогія, фізічнае выхаванне — з 21 па 30 чэрвеня, эканоміка працы, арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі — з 21 жніўня па 20 верасня.

**На вячэрняе аддзяленне:** руская мова і літаратура, матэматыка, фізіка, эканоміка працы, арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі.

Прыём заяў на спецыяльнасці: **руская мова і літаратура, матэматыка, фізіка з 20 красавіка па 31 мая, эканоміка працы, арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі з 20 чэрвеня па 31 жніўня.**

Уступныя экзамены па спецыяльнасці: руская мова і літаратура, матэматыка, фізіка — **з 1 чэрвеня па 20 чэрвеня;** эканоміка працы, арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі — **з 11 жніўня па 10 верасня.**

Залічэнне ў састаў студэнтаў на спецыяльнасці: руская мова і літаратура, матэматыка, фізіка — з 21 па 30 чэрвеня; эканоміка працы, арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі — з 21 жніўня па 20 верасня.

Паступаючыя ва універсітэт здаюць уступныя экзамены ў залежнасці ад выбранай спецыяльнасці па наступных дысцыплінах:

**беларуская і руская мовы і літаратуры** — па беларускай мове і літаратуры (пісьмова і вусна), гісторыі СССР (вусна), рускай мове і літаратуры (пісьмова);

**руская мова і літаратура** — па рускай мове і літаратуры (пісьмова і вусна), замежнай мове (вусна), гісторыі СССР (вусна);

**гісторыя** — па рускай мове і літаратуры або беларускай мове і літаратуры (пісьмова і вусна), гісторыі СССР (вусна), замежнай мове (вусна);

**матэматыка** — па матэматыцы (пісьмова і вусна), фізіцы (вусна), рускай мове і літаратуры або беларускай мове і літаратуры (пісьмова);

**фізіка** — па матэматыцы (пісьмова і вусна), фізіцы (вусна), рускай мове і літаратуры, або беларускай мове і літаратуры (пісьмова);

**эканоміка працы** — па матэматыцы (пісьмова), гісторыі СССР (вусна), геаграфіі (вусна), рускай мове і літаратуры або беларускай мове і літаратуры (пісьмова);

**арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі** — па матэматыцы (пісьмова і вусна), фізіцы (вусна), рускай мове і літаратуры або беларускай мове і літаратуры (пісьмова);

**біялогія** — па біялогіі (вусна), хіміі (вусна), матэматыцы (вусна), рускай мове і літаратуры або беларускай мове і літаратуры (пісьмова);

**фізічнае выхаванне** — па спецыяльнасці (лёгкая атлетыка, гімнастыка, плаванне), біялогіі (вусна), хіміі (вусна), рускай мове і літаратуры або беларускай мове і літаратуры (пісьмова).

Узнагароджаныя па заканчэнні сярэдняй школы **залатым (сярэбраным)** медалем або скончыўшыя сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову і сярэдняе прафтэхвучылішча з **дыпломам з адзнакай** здаюць толькі адзін з устаноўленых для адпаведнай спецыяльнасці ўступных экзаменаў, а іменна:

паступаючыя на спецыяльнасць беларуская і руская мовы і літаратуры — па беларускай мове і літаратуры (пісьмова), на спецыяльнасць руская мова і літаратура — рускай мове і літаратуры (пісьмова), на спецыяльнасць гісторыя — гісторыі СССР (вусна), на спецыяльнасці: матэматыка, арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі—матэматыцы (пісьмова), эканоміка працы—матэматыцы (пісьмова), на спецыяльнасць біялогія — па біялогіі (вусна), на спецыяльнасць фізічнае выхаванне — па спецыяльнасці (лёгкая атлетыка, гімнастыка, плаванне); на спецыяльнасць фізіка — па фізіцы (вусна).

Пры здачы экзаменаў з адзнакай «пяць» яны вызваляюцца ад далейшай здачы ўступных экзаменаў, а пры атрыманні адзнакі «чатыры» або «тры» здаюць экзамены па ўсіх адпаведных дысцыплінах.

Уступныя экзамены праводзяцца па праграмах, зацверджаных Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР, у адпаведнасці з праграмамі агульнаадукацыйнай школы.

Заява аб прыёме падаецца на імя рэктара універсітэта па адзінай форме (дадатак № 4 да Правілаў прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы СССР). Да заявы прыкладаюцца: дакумент аб сярэдняй адукацыі (у арыгінале), характарыстыка з апошняга месца работы для паступлення ва універсітэт, выпіска з працоўнай кніжкі, завераная гербавай пячаткай, медыцынская даведка (форма № 286), 4 фотакарткі (здымкі без галаўнога ўбора размерам 3×4 см).

На спецыяльнасці фізічнае выхаванне, арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі і біялогія прымаюцца асобы, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю або працуючыя па спецыяльнасці.

У першую чаргу залічваюцца асобы, характар работы якіх адпавядае выбранай у вышэйшай навучальнай установе спецыяльнасці, калі яны працуюць па гэтай спецыяльнасці не менш як шэсць месяцаў, выпускнікі сярэдніх спецыяльных і сярэдніх прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў, паступаючыя на аднародныя спецыяльнасці, а таксама звольненыя ў запас ваеннаслужачыя. Пры гэтым правам пераважнага залічэння карыстаюцца асобы, накіраваныя прадпрыемствамі, калгасамі, саўгасамі, установамі і арганізацыямі на навучанне па спецыяльнасці, якая адпавядае характару работы паступаючага, па прадстаўленні накіравання па адзінай форме (дадатак № 6 да Правілаў прыёму ў ВНУ).

Дакументы накіроўваць па адрасу: 246699, Гомель, вул. Савецкая, 108, універсітэт. прыёмнай камісіі.

Яўка на ўступныя экзамены — па выкліку універсітэта.

**Рэктарат.**

### ПАВЕДАМЛЕННЕ

**21 красавіка ў першым вучэбным корпусе (аўдыторыя 3—1) адбудуцца чарговыя заняткі школы маладога лектара. З лекцыяй «Ленінскае майстэрства рэвалюцыйнай прапаганды» выступіць сакратар парткома ГДУ У. В. Казлоў.**

**Затым будуць праходзіць секцыйныя заняткі.**

**Пачатак — у 18 гадзін.**

## Спорт

### АБ'ЯЎЛЕН МЕСЯЧНІК

Члены ўніверсітэцкай інспекцыі па ГПА праверылі, як на факультэтах афармляецца дакументацыя па Усесаюзнаму комплексу. У гэтай справе выяўлены істотныя недахопы, што стала прадметам абмеркавання на чарговым пасяджэнні названай інспекцыі. Па яе прапанове спартыўны клуб універсітэта вынес рашэнне аб правядзенні з 15 красавіка па 15 мая г. г. універсітэцкага месячніка па комплексу ГПА. Яго мэта — ажывіць работу па падрыхтоўцы і здачы норм сярод студэнтаў і асабліва выкладчыкаў, навесці парадак ва ўсёй справаздачнай дакументацыі.

Пасля пасяджэння інспекцыі па ГПА яе старшыня В. І. Селіванаў правёў семінарскія заняткі з тымі выкладчыкамі ўніверсітэта, якія нясуць непасрэдную адказнасць за своечасовасць і правільнасць афармлення дакументацыі па комплексу ГПА.

□

### ЛЁГКААТЛЕТЫЧНЫ КРОС

Ва ўніверсітэцкім парку праведзен веснавы лёгкаатлетычны крос па праграме круглагадовай універсіяды. Сярод дзяўчат дыстанцыю 500 м хутчэй за ўсіх пераадолела Г. Ламейка (эканамічны факультэт), 1000 м — Л. Сідарава (гістфіл). Студэнты факультэта фізічнага выхавання А. Блоцкі і В. Карпаў былі мацнейшымі адпаведна на дыстанцыях 1000 і 3000 м.

У камандным заліку перамаглі спартсмены факультэта фізвыхавання, на другім месцы — каманда мехмата, трэцім — эканамічнага факультэта.

□

**На здымку:** стартуюць дзяўчаты.

Фота **А. Карніенкі.**

□



ГУМАРЭСКА

## КАЛЁКВІУМ

Яшчэ да нядаўняга часу слова «калёквіум» не мела для мяне асаблівага значэння. Ведаў толькі, што паходзіць яно ад лацінскага «калоквіумус» і азначае гутарку, гаворку. Дык вось аднойчы пагутарыць запрасіла нас, другакурснікаў, выкладчыца беларускай мовы Антаніна Зіноўеўна Раманоўская.

...У вызначаны час з'явіліся мы ў аўдыторыі. Выкладчыца прасіла нас быць смялейшымі, як звычайна, на лекцыі. Але і мы заўважылі: крыху хвалявалася яна сама. Яно і зразумела: як там ні мяркуй, студэнтаў — трыццаць, паспей выслухаць.

Каб надаць гаворцы цёплы, сяброўскі характар і хаця крыху заваяваць давер'е выкладчыцы, размову з ёй павялі дзяўчаты, выдатніцы. Яны «шчабяталі» сваімі прыемнымі галаскамі аб розных там тэндэнцыях і шляхах, па якіх развівалася родная мова, і Антаніна Зіноўеўна пачала «адтаваць». Пакрысе з яе твару знікалі строгасць і сур'ёзнасць, але па-ранейшаму засталіся ўвага, засяроджанасць. Потым з'явілася ўсмешка, позірк стаў лагодным. Гутарка, як кажуць, праходзіла на ўзроўні.

Але ж, як мудра заўважыў адзін старажытны філосаф, добра ўсё тое, што не бывае без дрэннага. Калі ў размову пачалі ўступаць тыя, хто меў аб ёй не вельмі выразнае ўяўленне (у большасці сваёй, зразумела, хлопцы), выкладчыца пачала «ледзянець». І надзея заваяваць яе давер'е пачала знікаць.

Калі чарга адказваць дайшла да мяне, не ведаў, з чаго пачынаць. Прызнацца, ударыць тварам у гразь мне не хацелася. Успомніўшы ўсё, што ведаў, я пачаў гаварыць хутка, блытана, нібы мяне гналі ў шыю. Калі я скончыў, Антаніна Зіноўеўна некаторы час маўчала, відаць, адбірала з маёй блытаніны больш значнае, а потым пачала задаваць мне пытанні. Тут мне яшчэ цяжэй прыйшлося. На некаторыя пытанні я адказваў адразу ж, на іншыя — натужліва і не заўсёды так, як належыць. Я адчуваў сябе, як бягун перад фінішам, якога пакідаюць апошнія сілы. Памятаецца, я не мог прывесці прыкладаў з асабовымі і безасабовымі дзеясловамі. І толькі пасля некалькіх няўдалых спроб дайшоў да ісціны. «Шуміць... аўдыторыя», — сказаў я. Выкладчыца чакала прыкладу і на безасабовы дзеяслоў і запытальна глядзела мне ў вочы. «Шуміць ...ад адказаў у галаве», — пад канец выдаў я. Антаніна Зіноўеўна неяк ненатуральна паглядзела на мяне, ад чаго мне стала не па сабе, пасля сказала:

— Што ж, правільна. А ўвогуле, вы маглі б адказваць лепш, я ад вас большага чакала.

Калі я выйшаў з аўдыторыі, мне стала лёгка-лёгка, нібы цяжар з плеч скінуў. Я ішоў да сябе ў інтэрнат і думаў, што не ўсё яшчэ ведаем мы аб роднай мове. А «маглі б ведаць і больш», — прыгадаў я словы выкладчыцы. «Пабольш бы калёквіумаў, — падумалася мне, — усё б ведалі!»

**А. ШВЕДАЎ,**
**студэнт 2-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

ПАСЛЯ КРЫТЫКІ

## ПАНЕСЛІ СПАГНАННЕ

На змешчаны ў № 8 за 12 сакавіка гэтага года ў нашай шматтыражнай газеце артыкул «Крыўда і рэальнасць», дзе ўскрываліся недахопы ў рабоце ўніверсітэцкай сталовай, рэдакцыя атрымала адказ дырэктара трэста сталовых, рэстаранаў і кафэ Л. Я. Самахвалавай. Яна паведаміла, што крытычны артыкул абмеркаваны на нарадзе кіраўнікоў трэста. У калектыве сталовай № 40 сумесна з адміністрацыяй і групай народнага кантролю ГДУ праведзена нарада, на якой былі ўскрыты прычыны вузкага асартыменту і дрэннай якасці страў. Намечаны мерапрыемствы па ўхіленню ўказаных у артыкуле недахопаў.

Загадам № 18 ад 18 сакавіка за парушэнне правілаў савецкага гандлю паварам, віноўным у нізкай якасці і ў недаваажванні страў, аб'яўлена вымова.

Работа сталовай узята гандлёвым аддзелам і лабараторыяй трэста пад кантроль.

### ПРАПАНУЕ ШТАБ ВЫХАДНОГА ДНЯ

**У нядзелю, 17 красавіка, для студэнтаў і супрацоўнікаў у актавай зале ўніверсітэта будзе дэманстравацца мастацкі фільм «Каліна чырвоная». Пачатак кінасеанса ў 20 гадзін.**

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**


АЗ 04541

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ, профкома и месткома Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю, Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш.

Наш адрас: вул. Кірава, 119, корпус № 2, П 4-8, т. 6-75-10. Фармат 600×420 мм. Тыраж 2000 экз.

Заказ 2600.